**Назва вучэбнай дысцыпліны:**
**“Беларуская дыялекталогія”**

| | |
|---|---|
| **Код і найменне спецыяльнасці** | 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура |
| **Курс навучання** | 1 |
| **Семестр навучання** | 2 |
| **Колькасць аўдыторных гадзін:** | 56 |
| **Лекцыі**<br>**Семінарскія заняткі**<br>**Практычныя заняткі**<br>**Лабараторныя заняткі** | 28 |
| | |
| | - |
| | 28<br>- |
| **Форма бягучай атэстацыі (*залік/ дыферэнцыраваны залік/экзамен)*** | экзамен |
| **Колькасць заліковых адзінак** | 3 |
| **Кампетэнцыі, якія фарміруюцца** | СК-4 Выяўляць тэрытарыяльныя асаблівасці беларускай нацыянальнай мовы ў супастаўленні з літаратурнай мовай, ажыццяўляць іх дыяхранічную і лінгвагеаграфічную інтэрпрэтацыю. |

**Кароткі змест вучэбнай дысцыпліны:**

Курс “беларуская дыялекталогія” займае важнае месца ў падрыхтоўцы спецыяліста-філолага. Дыялекталогія, па-першае, дапамагае зразумець шляхі фарміравання літаратурнай мовы, раскрываючы ролю ў гэтым працэсе канкрэтных дыялектаў, што асабліва актуальна для беларускай літаратурнай мовы, якая склалася непасрэдна на базе мясцовых гаворак. Па-другое, вывучэнне рэліктавых моўных з’яў, якія да нашых дзён захаваліся ў гаворках, дазваляе лепш разабрацца ў гістарычных моўных асаблівасцях і працэсах. Гэта спрыяе больш глыбокаму засваенню студэнтамі курсаў сучаснай літаратурнай мовы, гісторыі літаратурнай мовы і гістарычнай граматыкі. Акрамя таго, веданне дыялекталогіі неабходна студэнту – будучаму настаўніку, які будзе працаваць ва ўмовах дыялектнага асяроддзя, каб дапамагчы дзецям у сельскіх школах авалодаць літаратурнай мовай, навучыць іх дакладна размяжоўваць сферы функцыянавання дыялектнай і літаратурнай моўнай разнавіднасцяў.